# КРЫЛО Ў КРЫЛО

Даўно ужо, на адной з сустрэч у рэдакцыі, хтосьці з жэяег пазнэёміў нас («Дзені- сенка, той самы»). Вельмі рухавы, ён адразу, з першай размовы, зацікавіў сваёй выразнай, напорыстай гаворкай. Губы яго імшы раз крыху крывіліся ў скрытай усмешцы назіральнага, усё зауважаючага чалавека, які любіць па ледзь толькі ўлавімых , прыкметах вызначаць настрой, рысу або нават характар субяседніка. Гледзячы на Рыгора Кірылавіча, можна лёгка разгадаць, што пры ўсёй сваёй уяўнай непаседлівасці і парывістасці гэты чалавек унутрана вельмі ўстойлівы. Толькі устойлівасць ён знаходзіць не ў спакоі, а ў руху. Здаецца, што спакой яму проста протіпаказаны. Ён наскрозь дынамічны і ў дзеяннях сваіх заўсёды вельмі мэтанакіраваны. Таму так многа паспеў у жыцці? Не толькі...

Доўга думала над гэтым «не толькі». Хацелася вызначыць, што ж «самае-самае» ў такім нялёгкім, але зайздросным лёсе? Адказ прыйшоў нечакана проста. У нашым абласным краязнаўчым музеі сярод многіх матэрыялаў пра Героя Савецкага Саюза Р. К. Дзенісенку ёсць яго асабістыя ўспаміны пра дні Вялікай Айчыннай вайны, а ў іх такія радкі: «...увайшоўшы ў гэтую дружную баявую сям'ю франтавых лётчыкаў, стараўся праявіць сваё ўменне, змагацца за Радзіму разам, крыло ў крыло».

Крыло ў крыло... Яго шлях у неба пачынаўся так: Славянскі аэраклуб на Украіне, Варашылаўградская ваенная авіяцыйная школа імя Пралетарыяту Данбаса, якую закончыў на выдатна, і яго, як умелага спецыяліста, пакінулі там інструктарам. Але ўжо больш двух гадоў ішла Вялікая Айчынная вайна, і Рыгор рваўся на фронт. Пісаў рапарт за рапартам і, нарэшце, восенню сорак трэцяга года прыбыў у 235-ты штурмавы авіяцыйны полк, які дзейнічаў на 1-м Украінскім фронце ў раёне Кіева. Баявое хрышчэнне пачалося ўдала. Ужо менш, чым праз месяц баявых вылетаў Рыгор Кірылавіч быў адзначаны першай



Зусім не лёгкі на пахвалу камандзір эскадрыллі капітан П. Дылько ў прадстаўленні да гэтай узнагароды знайшоў такія словы: «Бясстрашны сокал», «Майстар штурмавых udараў», «Паветраны снайпер».

Узнагарод у Р. К. Дзенісенкі нямала: ордэн Леніна, два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Аляксандра Неўскага, чатыры ордэны Айчыннай вайны I ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі, медалі. Але і шлях быў нялёгкім. На 27-м баявым вылеце яго самалёт так зрашэціла, што ледзь прызямліўся на сваім пярэднім краі. У адным з баёў загінуў камандзір эскадрыллі, храбры чалавек, верны таварыш. «Адпомсцім за Дылько», — напісаў Рыгор Кірылавіч на сваім «Ільюшыне» і з гэтым надпісам-заклікам да канца вайны зрабіў яшчэ 170 баявых вылетаў. Смела І ўмела, крыло ў крыло выконваў баявыя заданні ў Корсунь-Шаўчэнкаўскай аперацыі, у баях за Вінніцу, Праскураў, Будапешт, а 9 мая 1945

года разам з таварышамі па зброі спяшаўся на дапамогу паўстаўшай Празе...

Камандзір 235-га штурмавога Праскураўскага авіяцыйнага палка, у якім тады служыў капітан Дзенісенка, пісаў у данясенні: «У гэтым баі, як і ў папярэдніх, лётчык-камуніст Р. К. Дзенісенка першым кінуў свой «лятаючы танк» у піке. Прамой наводкай, ва ўпор, ён знішчаў тэхніку і жывую сілу праціўніка».

Пра тое, як ваяваў гэты чалавек, красамоўна сведчаць і такія факты: яму, як і яшчэ 75 лётчыкам праслаўленага 5-га авіяцыйнага штурмавога корпуса, якім камандаваў герой чалюскінскай эпапеі, генерал лейтэнант авіяцыі Мікалай Пятровіч Каманін, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Рыгор Кірылавіч — удзельнік двух ваенных парадаў у Маскве — грознага 1941-га і юбілейнага 1985 года, быў і выступаў на ўрачыстым прыёме ў ЦК КПСС ветэранаў вайны і працы, былых воінаў, партызан і падпольшчыкаў 5 мая саракавога года Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Не толькі на фронце жыццё яго ішло так напружана, не ведаючы стомленасці і ўпадку, у нейкім крытычным радыусе, які, між іншым, вельмі дакладна выверана. Пасля вайны Рыгор Кірылавіч служыў у Ваенна-Паветраных Сілах краіны, быў начальнікам Курскага, Саратаўскага і Гомельскага аэраклубаў ДТСААФ. Калі вы адкрыеце кнігу Юрыя Аляксеевіча Гагарына «Дарога ў космас», зможаце прачытаць там захапляючыя, поўныя сардэчнай радасці словы пра Р. К. Дзенісенку — ён жа быў настаўнікам першага ў свеце касманаўта, зорнага сына Расіі. Творчы дэвіз «крыло ў крыло» і тут рабіў сваю добрую справу: курсанты Саратаўскага аэраклуба вучыліся лятаць у асаў савецкай авіяцыі.

З 1956 года Рыгор Кірылавіч жыве і працуе ў Гомелі. Многія лётчыкі— рэкардсмены самалётнага, планернага і парашутнага спорту памятаюць яго, свайго «бацьку», начальніка нашага абласнога аэраклуба ДТСААФ, які вучыў іх быць акрыленымі не толькі ў небе, але і на зямлі.

Ганарацца Р. К. Дзенісенкам і ў калектыве Гомельскага завода «Электраапаратура», дзе ён быў старшым інжынерам, а цяпер узначальвае аддзел. Тут яму нязменна аказваюць вялікае давер’е — чатыры скліканні выбіралі ў Цэнтральны раённы Савет, зараз Рыгор Кірылавіч Дзенісенка — дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў. А яшчэ ён — адзін з самых палулярных лектараў эбласной арганізацыі таварыства «Веды», любімец моладзі, якая, затаіўшы дыхание, слухае яго расказы аб подзвігах ваенных і мірных, аб героях космасу і сціплых працаўніках-гамяльчанах, аб перабудове, якая кліча нас усіх дзейнічаць «крыло ў крыло», не ведаючы стомленасці і сумненняў. А яшчэ ён — старшыня абласнога савета ветэранаў вайны і працы.

Нядаўна ў жыцці Р. К. Дзенісенкі адбылася новая вялікая падзея. На чарговай, красавіцкай сесіі гарадскога Савета народных дэпутатаў яму і яшчэ траім нашым землякам — намесніку дырэктара сярэдняй школы № 44 па вучэбна-выхаваўчай рабоце, кавалеру трох ордэнаў Славы Мікалаю Апанасавічу Лебедзеву, Герою Сацыялістычнай Працы, брыгадзіру слесараў аб’яднання «Гомсельмаш» Пятру Купрыя- навічу Кавалёву і народнаму артысту БССР, заслужанаму дзеячу мастацтваў рэспублікі Аляксандру Аляксеевічу Рыбальчанку прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гомеля».

Вестка аб гэтым абрадавала ўсіх нас, гамяльчан, вясенняй ластаўкай прыляцела яна ў сем'і віноўнікаў урачыстага акта. Рыгора Кірылавіча па-дамашняму задушэўна павіншавалі жонка, сын Уладзімір — слесар-наладчык паліграфічнага абсталявання на фабрыцы «Палесдрук», дачка Наташа, якая са сваёй сям’ёй (муж —ваенны) знаходзяцца зараз у Венгрыі, усе блізкія і далёкія родзічы. Але ярчэй за ўсё гарэлі вочы ва ўнукаў — школьнікаў Алены, Сярожы і Тані. Толькі двухгадовы Кірыл не вельмі разумеў, што адбылося, але ўсё роўна радасна цягнуў да дзеда свае рукі.

Самае вялікае багацце ў доме Дзенісенкаў — кнігі. Іх не злічыць. На асаблівым месцы — літаратура аб авіяцыі і касманаўтыцы. Толькі што тутважна стаў і кароткі біяграфічны слоўнік «Героі Савецкага Саюза», у першым томе якога ёсць словы і пра Рыгора Кірылавіча, а праз

некалькі старонак — І пра яго стрыечнага брата Мікіту Васільевіча Гаманенку, камсорга эскадрыллі, які загінуў у баі пад Днепрапятроўскам у канцы жніўня 1941 года.

У гэтай кватэры шмат рэліквій — дакументаў, фотаздымкаў. пісьмаў і паштовак. Сярод іх невялікі самалёцік— мадэль «Яка-18», якую адліў Юрый Гагарын, калі вучыўся ў індустрыяльным тэхнікуме і быў курсантам Саратаўскага аэраклуба. Па гэтай мадэлі маладыя хлопцы на занятках вывучалі сваю будучую крылатую птушку. Адзін такі самалёцік Рыгор Кірылавіч падарыў музею Зорнага гарадка, дзе ў яго нямала сяброў. А вось гэты захоўваецца ў доме героя, палкоўніка ў адстаўцы, як дарагі ўспамін, як сімвал братняй баявой і працоўнай садружнасці савецкіх людзей, іх імкнення дзейнічаць «крыло ў крыло».

**З. ЗАЙЦАВА.**